## Бандарныя вырабы

**Даёнка –** бандарная пасудзіна на 6-10 літараў, крыху шырэйшая ў верхняй частцы, якая выкарыстоўвалася ў час даення кароў.



**Конаўка –** невялікая драўляная( з клёпак ці выдзеўбаная) пасудзіна з ручкай.



**Барылка – бандарны выраб, двухдонная бочачка на 5-10 літраў, якая прызначалася для пераносу вады ў “рабочы вугал” (на поле, сенажаць, лесасеку).**



**Маслабойка – бандарны выраб, пасудзіна для збівання малака.**



**Дзежка – пасудзіна для заквашвання цеста.**




**Кадаўб – выдзеўбаная пасудзіна цыліндрычнай ці блізкай да яе формы.**




**Баклага – бандарны выраб, пляскатая пасудзіна для вады.**



**Цэбар** - шырокая круглая драўляная пасудзіна з клёпак з двума вушкамі.

